Прывалка. Пад абаронай арханёла Міхала

Аўтар: Андрэй Вашкевіч
10.10.2021 00:00

Каля старога рэчышча Нёмана ў некалькіх дзесятках кіламетраў на поўнач ад Гродна

знаходзіцца вёска Прывалка. Мясцовыя жыхары традыцыйна выводзяць назву вёскі ад “праваленага месца”, паколькі побач знаходзіцца маляўнічая даліна Райгарад, дзе, згодна з легендай, некалі знаходзіўся вялікі горад, які праваліўся пад зямлю, паколькі мясцовыя жыхары вялі нехрысціянскае жыццё. Але адна з першых гістарычных згадак пра Прывалку адносіцца да 1609 года, калі кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт Ваза заснаваў у вёсцы асобную каталіцкую парафію, надзяліўшы яе шасцю валокамі зямлі. †

Прывалка ў гэты час належала да ўласнасці вялікага князя, яе жыхары павінны былі забяспечваць каралеўскі шлях з Варшавы ў Вільню коньмі і харчаваннем. У Прывалцы знаходзіўся каралеўскі двор, да якога, таксама як і да парафіі, адносіліся галоўным чынам вёскі, якія цяпер знаходзяцца на тэрыторыі Літвы.

Ужо ў самым канцы існавання Рэчы Паспалітай Прывалка атрымала прывілей на самакіраванне, які цяпер захоўваецца ў Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі. На гербе быў адлюстраваны арханёл Міхал, які скідае ў пекла д’ябла. Магчыма, герб з’яўляецца нейкай адсылкай да гісторыі пра “правалены” горад Райгарад.

У часы Расійскай імперыі касцёл у Прывалцы ўжо быў трэцяй драўлянай святыняй на гэтым месцы. Ксёндз, таксама як і парафіяне, жыў вельмі небагата, атрымліваючы даход яшчэ са старой каралеўскай фундацыі, а таксама невялікае грашовае ўтрыманне ад царскага ўраду. За ўдзел у паўстанні 1863 года многія жыхары Прывалкі былі высланы ў Сібір, а касцёл зачынены і перададзены праваслаўнаму прыходу ў Друскеніках. Святыня не выкарыстоўвалася і ў 1914 годзе згарэла.

Будаўніцтва сучаснага касцёла вялося ў 1918–1920 гадах. Святыня была асвечана ў ліпені 1920 года і ўжо больш за стагоддзе з’яўляецца самым важным і прыгожым будынкам Прывалкі. Да 1939 года намаганнямі парафіян і мясцовых пробашчаў святыня была забяспечана ўсім неабходным, але падзеі 1939 года зноў сталі выпрабаваннем для жыхароў Прынёмання. Апошні даваенны святар кс. Антоні быў арыштаваны немцамі і знік у лагерах, а пасля вайны, у 1962 годзе, парафію ліквідавалі савецкія ўлады. Рабіліся намаганні разбурыць касцёл, як гэта было зроблена ў суседнім Пераломе. У дадатак, на касцёл павалілася дрэва, якое прабіла дах.

У 1990 годзе святыня была нарэшце вернута парафіянам, якія на чале з кс. Станіславам Гаўлікам яе аднавілі. 29 кастрычніка 1994 года, у свята заступніка касцёла, яго зноў асвяцілі пад тытулам св. апостала Юды Тадэвуша. Кс. Станіслаў Гаўлік працаваў у Прывалцы да 1996 года. Дасюль у касцёле знаходзіцца мемарыяльная табліца ў памяць аб гэтым цудоўным чалавеку, святары, які ў канцы XX стагоддзя аднавіў або нанова пабудаваў у ваколіцах Гродна некалькі капліц і касцёлаў.